УДК 378.017.4:94(476)

І. М. Рыжанкоў, ст. выкладчык

# ДА ПРАБЛЕМЫ ВЫХАВАННЯ ПАТРЫЯТЫЗМУ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ Ў КАНТЭКСЦЕ ВЫКЛАДАННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

In article some aspects of patriotic formation of student's youth in a context of studying of history of Belarus are considered. Features of the educational moments on seminar employment on various patriotic subjects Besides, reveal. In article stages of preparation and carrying out of student's thematic conferences devoted to visible events of history of Belarus are shined.

**Уводзіны.** Важнае месца ў напрамку фармавання патрыятычных уяўленняў, мэт і ідэалаў у сучаснай студэнцкай моладзі нададзена дысцыпліне гісторыя Беларусі ў кантэксце цывілізацыйнага і рэгіянальнага развіцця. Але пошук, выбар і далейшае выкарыстанне належнага і эфектыўнага метадычнага інструментарыя ва ўздзеянні на студэнцкую свядомасць, светапогляд патрабуе ад выкладчыка ўдумлівае і адказнае стаўленне.

**Асноўная частка.** Неблагім метадычным сродкам уплыву з'яўляецца традыцыйная рэфератыўная праца. У прыватнасці аб жыццядзейнасці выбітных імён Полацкага княства, якія абаранялі ідэалы асветы, служэння народу і Бацькаўшчыне. Таксама значную зацікаўленасць у студэнтаў выклікае тэма «Залатое стагоддзе» ВКЛ. Дзейнасць кн. Вітаўта, Казіміра і іншых спрыяла абароне важных каштоўнасцей: незалежнасці і суверэнітэту дзяржавы. Варта ўзгадаць тэму культуры ВКЛ, гатычны і барочны накірункі архітэктуры. Добрым узорам падаецца асветніцкая дзейнасць М. Гусоўскага, Ф. Скарыны, мецэнацтва М. Радзівілы Чорнага. Пачуцці павагі да сваёй Радзімы выяўляюцца падчас вывучэння этапаў вырашэння нацыянальна-дзяржаўнага пытання беларусаў ва ўмовах абвяшчэння БССР. Самаадданая праца А. Р. Чарвякова, З. Х. Жылуновіча, у прыватнасці ў беларускіх секцыях РПК(б), Часовым рэвалюцыйным рабоча-сялянскім урадзе Беларусі, ЦВК БССР.

Асвятленне гісторыі незалежнай Рэспублікі Беларусь спрыяе кансалідацыі моладзі і ўзмацненню патрыятычных пачуццяў. На семінарах, прысвечаных сучаснай гісторыі краіны, студэнты пагаджаюцца з тым, што кожны грамадзянін павінен мець уяўленні аб этапах станаўлення дзяржаўных сімвалаў – герба, сцяга і гімна; палітычнай сістэме Рэспублікі Беларусь; гонар за дасягненні краіны ў сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сферы, спорце і культуры. Цікавай методыкай, якая ўзбуджае грамадзянскія пачуцці студэнтаў, падаецца арганізацыя тэматычных канферэнцый. Так, 17 лістапада 2008 г. пад кіраўніцтвам д-ра гіст. навук М. Я. Сяменчыка і аўтара публікацыі студэнты 1 курса факультэта ВСіП наладзілі канферэнцыю «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне». На першым, падрыхтоўчым, этапе канферэнцыі студэнты працавалі з літаратурай, шукалі фактычны матэрыял, ілюстрацыі аб славутых барацьбітах з нямецка-фашысцкім рэжымам. У выніку праведзенага конкурса на канферэнцыі была наладжана выстава рэфератаў і тэматычных газет. На другім этапе (канферэнцыі) аўтары лепшых рэфератаў агучылі здабыткі сваіх даследаванняў. Выступленні суправаджаліся дэманстрацыяй электронных прэзентацый на відэапраектары. Безумоўна, да эфектыўных сродкаў варта аднесці метад конкурсных праектаў. Адпаведна далучэнне студэнтаў да ўдзелу ў рэспубліканскіх конкурсах навуковых і творчых прац [1, с. 215]. Пад кіраўніцтвам аўтара публікацыі на 1-м Рэспубліканскім конкурсе прац школьнікаў, студэнтаў і выкладчыкаў «Холокост. История и современность», арганізаваным Саюзам яўрэйскіх арганізацый і абшчын і грамадскім аб'яднаннем «Республиканский Фонд Холокост», Музеем гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і Камітэта па справах нацыянальнасцяў, Ермаловіч М. С. (факультэт ХТіТ, 4 курс, 14 група) заняла другое месца ў намінацыі «Краязнаўства» за працу «Гетто Полоцка», Шушкевіч Д. А. (факультэт ТАР, 2 курс, 4 група) – другое месца ў намінацыі «Мульцімедыйныя праекты, прэзентацыі» за працу «В память Холокоста м. Илья». Падобная актыўнасць студэнтаў спрыяе фармаванню агульначалавечых перакананняў, выхоўвае ў святле мірнага суіснавання розных нацый.

**Заключэнне.** Такім чынам, выкладчыкі гісторыі Беларусі маюць дастатковы інструментарый, які дазваляе сфармаваць правільныя патрыятычныя і грамадзянскія ўяўленні: годнасць за мінулае, адчуванне пераемнасці са спадчынай, падтрымка нацыянальных каштоўнасцей, папулярызацыя сацыяльна-эканамічных дасягненняў Беларусі [2, с. 16]. У той самы час нельга забываць аб важнасці інтэрнацыянальнага выхавання, павагі да іншых культур.

## Літаратура

1. Кукушкин, В. С. Теория и методика воспитательной работы: учеб. пособие / В. С. Кукушкин. – Ростов-на-Дону: Март. – 2007. – 320 с.
2. Русецкий, А. В. Формирование патриотических ценностей в высшей школе / А. В. Русецкий, Л. А. Гащенко // Вышэйшая школа. – 2001. – № 6. – С. 106.